Пераможца Нацыянальнага конкурсу друкаваных сродкаў масавай інфармацыі "Залатая Літара"

ГАЗЕТА ЎСТАНОВЫ АДУКАЦЫІ «ГРОДЗЕНСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ»

ГРОДЗЕНСКІ ЎНІВЕРСІТЭТ

Выдаецца з 1986 года

Выходзіць адзін раз на месяц

№8 (561)
9 верасня 2026 года

Распаўсюджваецца бясплатна











Студэнцкі верасень не ведае шаблонаў

Хтосьці робіць першыя крокі ў Купалаўскім універсітэце, і яго гісторыя толькі пачынае пісацца. Для іншых гэта апошняе свята ведаў у якасці студэнта, але ніяк не ў статусе купалаўца, бо сувязь з роднай alma-mater – гэта на ўсё жыццё.

Па добрай традыцыі новы навучальны год распачынаецца ў самым сэрцы Купалаўскага ўніверсітэта з урачыстага мерапрыемства, прысвечанага Дню ведаў! Сімвалічна, што сёння на свяце сабраліся 898 удзельнікаў. Гэта лічба не выпадковая – яна адпавядае хуткаму 898-годдзю з дня заснавання нашага горада над Нёманам.

З цёплымі словамі да прысутных звярнулася рэктар універсітэта **Ірына Кітурка**:

– Сёння мы афіцыйна распачынаем новы навучальны год. Вельмі хочацца, каб мы ўсе з вамі памяталі, што вучоба ва ўніверсітэце – гэта не проста шпацыр па жыцці. Гэта штодзённая вялікая праца. Новы навучальны год – гэта заўсёды новыя планы. Не адкладвайце іх на заўтра, пачніце ажыццяўляць іх ужо сёння! А наш універсітэт адпаведна са сваёй місіяй будзе ісці разам з вамі па гэтым шляху і ганарыцца кожным вашым поспехам.

Урачыстасць аб'яднала супольнасць універсітэта і ганаровых гасцей. З пачаткам новага навучальнага года купалаўцаў павіншавалі старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў Алена Пасюта, кіраўнік Гродзенскай епархіі Беларускай праваслаўнай царквы, архіепіскап Гродзенскі і Ваўкавыскі Антоній, а таксама дэкан факультэта міжнародных адукацыйных праграм Ташкенцкага дзяржаўнага транспартнага ўніверсітэта Алімжон Рыскулаў.

– У мяне сёння ганаровая місія – ад імя кіраўніцтва Гродзенскай вобласці павіншаваць вас з пачаткам новага навучальнага года. Хочацца выказаць вам, паважаныя выкладчыкі, шчырыя словы ўдзячнасці за тую работу, якую вы выконваеце разам з нашымі студэнтамі. Паважаныя студэнты, няхай вашае жыццё будзе самым неверагодным у нашай alma-mater. Наталяйцеся ведамі і цёплымі ўспамінамі. І, канешне, мы чакаем вас у якасці прафесіяналаў, якія будуць працаваць на карысць нашай вобласці, – з цеплынёй павіншавала **Алена Пасюта**.

Яшчэ адной важнай і прыемнай падзеяй свята стала ўручэнне пасведчанняў «Аб занясенні на Дошку гонару па выніках 2025/2026 навучальнага года» лепшым навучэнцам, студэнтам, магістрантам і аспірантам універсітэта. Сваімі эмоцыямі падзяліўся студэнт 4 курса фізіка-тэхнічнага факультэта **Яўгеній Жукоўскі**:

– Для кожнага студэнта першае верасня – гэта яркае, насычанае свята. Яно заўсёды асацыюецца з радасцю і цёплымі эмоцыямі. Як намеснік старшыні Студэнцкага савета ўніверсітэта я курырую моладзевую палітыку і працу са студэнтамі, імкнуся зрабіць будні купалаўцаў больш яркімі і камфортнымі. Для мяне гэты навучальны год перадапошні, і вельмі хочацца закласці моцны фундамент на 5 курс – трымаць высокую планку, годна прадстаўляць родны ўніверсітэт!

Пачатак. Працяг чытайце на стар.4

ЧЫТАЙЦЕ Ў НУМАРЫ

АФІЦЫЙНА

Пераўтварыць вынікі ў магчымасці

У ГрДУ прайшло пасяджэнне Савета ўніверсітэта, прысвечанае пачатку навучальнага года

Стар. 3

ЮБІЛЕЙ

З падыходам вучонага і жылкай гаспадара

Дырэктар Тэхналагічнага каледжа Андрэй Буць даў інтэрв'ю да свайго юбілею

Стар. 9

ВЫПУСКНІКІ

Ад студэнцкай парты да працоўнага месца

Маладыя спецыялісты, выпускнікі-купалаўцы, падзяліліся ўражаннямі ад першых працоўных будняў

Стар. 10

Афіцыйна

Рэктар заўсёды вучыцца



Напярэдадні новага навучальнага года, з 26 па 27 жніўня, у Мінску прайшла другая нацыянальная школа рэктараў пад назвай «Універсітэт будучыні: апераджальная падрыхтоўка кадраў, тэхналагічны суверэнітэт, выхаванне ў лічбавым асяроддзі, экспартны патэнцыял вышэйшай школы». Удзельнікам форуму стала і рэктар ГрДУ імя Янкі Купалы Ірына Кітурка.

Мерапрыемства, арганізаванае Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь, аб'яднала рэктараў вядучых універсітэтаў краіны, кіраўнікоў профільных ведамстваў, а таксама прадстаўнікоў Нацыянальнай акадэміі навук, Парка высокіх тэхналогій і дзелавых колаў.

На працягу двух дзён удзельнікі мерапрыемства абмяркоўвалі ключавыя пытанні сучаснай вышэйшай адукацыі: ад грамадзянскага выхавання моладзі да інтэграцыі штучнага інтэлекту ў навучальны працэс.

Праграма першага дня пачалася з азнаямленчага практыкума. На базе Белтэлерадыёкампаніі ўдзельнікі абмеркавалі алгарытмы ўзаемадзеяння са сродкамі масавай інфармацыі пры асвятленні рэзанансных інфармацыйных нагод. Затым там жа прайшла секцыя "У фокусе – моладзь: медыягігіена і выхаванне ў лічбавую эпоху". У якасці спікераў і экспертаў выступілі Міністр інфармацыі Рэспублікі Беларусь Дзмітрый Жук, намеснік Міністра адукацыі Кацярына Пятруцкая і генеральны дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Вадзім Гігін. Далей удзельнікі Школы рэктараў адправіліся ў Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь, дзе прынялі ўдзел у секцыі "Інструменты дыверсіфікацыі экспарту: сеткавая адукацыя і стратэгіі прысутнасці на новых рынках". Наступная секцыя пад назвай "Эканоміка ведаў і тэхналагічны суверэнітэт: камерцыялізацыя, фінансаванне і інтэграцыя навукі" прайшла ў Прэзідыуме Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Спікерамі выступілі старшыня Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Уладзімір Каранік, старшыня Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь Дзяніс Каржыцкі, старшыня Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь Аляксандр Гучок, генеральны дырэктар ААТ «Пеленг» Павел Пазнякоў і генеральны дырэктар ААТ "Планар" Сяргей Авакаў. Секцыя «Кіраванне лічбавым ландшафтам ВНУ: этыка штучнага інтэлекту, генератыўныя нейрасеткі, лічбавая інфраструктура» прайшла ў Парку высокіх тэхналогій. Спікерамі і экспертамі гэтай секцыі выступілі Міністр сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь Кірыл Залескі, начальнік сакратарыята Наглядальнага савета Парка высокіх тэхналогій Ганна Рабава, намеснік начальніка Сакратарыята Наглядальнага савета Парка высокіх тэхналогій Дзмітрый Ліхачэўскі і іншыя.

Другі дзень праграмы прайшоў на базе Нацыянальнага дзіцячага тэхнапарка. Ён пачаўся з наведвання навуковых лабараторый і азнаямленчай экскурсіі. Фіналам Нацыянальнай школы рэктараў стала пасяджэнне на чале з Міністрам адукацыі Рэспублікі Беларусь Андрэем Іванцом. Удзельнікі падвялі вынікі секцыйнай працы і правялі адкрытую дыскусію па выніках выязных практыкумаў.

Галоўным вынікам двухдзённага форуму стала прыняцце Рэзалюцыі і фарміраванне пакета рэкамендацый. Гэтыя дакументы паслужаць практычным кіраўніцтвам для рэктара і прафесарска-выкладчыцкага складу вышэйшых навучальных устаноў, а таксама вызначаць вектар павышэння якасці вышэйшай адукацыі ў Беларусі.

Ул. інф.

Свята

Выбар – служыць Радзіме

5 верасня ў межах святкавання Дня нараджэння горада Гродна на мемарыяльным комплексе "Курган Славы" адбылася ўрачыстая цырымонія прыняцця Ваеннай прысягі курсантамі першага курса ваеннага факультэта ГрДУ імя Янкі Купалы. У гэты дзень маладыя людзі прамовілі клятву на вернасць Радзіме, уступіўшы ў рады абаронцаў Айчыны.



Напярэдадні прысягі, 1 верасня, з курсантамі ваеннага факультэта сустрэўся Міністр абароны Рэспублікі Беларусь **Віктар Хрэнін**. Гэтая падзея падкрэсліла высокі статус ваеннага факультэта Купалаўскага ўніверсітэта. Віктар Хрэнін акрэсліў ключавыя задачы, якія стаяць перад курсантамі і выкладчыкамі ў найбліжэйшай перспектыве.

На ўрачыстай цырымоніі прыняцця Ваеннай прысягі ў ліку запрошаных гасцей былі намеснік Міністра абароны па тыле – начальнік тылу Узброеных Сіл генерал-маёр **Аляксандр Масалаў**:

– Сёння важны дзень у курсантаў першага курса Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. Яны далі клятву. Клятву нашаму народу і нашай дзяржаве. З гэтага моманту ў іх з'явілася асабістая адказнасць за лёс нашай краіны. Па іх тварах відаць, што курсанты здолеюць годна працягнуць усе традыцыі нашай арміі, – падкрэсліў Аляксандр Масалаў.



З прывітальным словам да прысутных звярнулася рэктар універсітэта **Ірына Кітурка**. Яна адзначыла, што ганарыцца высокім узроўнем падрыхтоўкі курсантаў на ваенным факультэце:

– Менавіта тут фарміруюцца сапраўдныя прафесіяналы сваёй справы, якія абралі найбольш мірныя з ваенных прафесій – афіцэры тылу і афіцэры, якія клапоцяцца аб фізічнай падрыхтоўцы нашых салдат у войсках.

Ірына Фёдараўна падкрэсліла, што сённяшняя падзея на Кургане Славы выходзіць далёка за межы ўніверсітэцкага жыцця, бо 54 курсанты ваеннага факультэта прымаюць прысягу на вернасць Радзіме, Айчыне і народу. Гэтае свята не толькі для саміх курсантаў, але і для іх бацькоў. Шчырыя пажаданні прагучалі з вуснаў **Анастасіі Баравік**, маці курсанта **Данілы Баравіка**:



– Сёння вы зрабілі не проста крок, вы здзейснілі сапраўдны скачок ад юнацтва да сталасці. Гэты дзень наша агульнае свята. Мы верым у вас, мы молімся за вас, мы ганарымся вамі!



– Гэты дзень назаўжды застанецца ў маёй памяці. Прыняцце ваеннай прысягі – падзея, да якой я ішоў свядома, але калі настаў момант вымавіць гэтыя словы перад сваімі таварышамі, камандзірамі і блізкімі, эмоцыі проста захліснулі. У той момант я адчуў адказнасць і разам з тым вялікі гонар. Крок у будучыню зроблены, і гэта лепшы пачатак службы, – падзяліўся курсант 1 курса ваеннага факультэта **Міраслаў Блатніцкі.**

Пасля афіцыйнай часткі курсанты вымавілі словы прысягі. Гэты рытуал стаў для іх кропкай адліку на шляху служэння Айчыне. У іх вачах – рашучасць, у сэрцах – хваляванне і ўсведамленне адказнасці.

Напярадзе ў маладых абаронцаў – гады вучобы, трэніровак і выпрабаванняў, але галоўны выбар яны ўжо зрабілі: выбар на карысць Радзімы.

Ул. інф.
Фота з архіва ўніверсітэта

В ГрГУ имени Янки Купалы прошёл круглый стол «Молодой специалист – 2026»

Событие

Превратить вызовы в возможности

1 сентября в ГрГУ имени Янки Купалы прошло торжественное расширенное заседание Совета университета, посвященное началу учебного года. На повестке дня – приоритеты работы на предстоящий учебный год. В рамках заседания наградили лучших купаловцев, а также подписали документы о сотрудничестве с организацией-заказчиком кадров ГРУП «Гродноэнерго». Онлайн-трансляция позволила всем желающим следить за событием в реальном времени.



Открыла заседание председатель Совета университета, ректор **Ирина Китурко**. Свое выступление она начала со слов приветствия участникам заседания и почетным гостям.


«По традиции перед началом нового учебного года мы всегда ставим перед собой цели и задачи, которые базируются на разработанной и принятой нами Стратегии лидерства на основе качества. Сегодня мы поговорим о том, что в настоящее время наиболее волнует университет и систему образования, – о новых вызовах внешней среды. Лидером будет тот, кто сумеет превратить вызовы в возможности и свои конкурентные преимущества», – отметила спикер.

В своем докладе **«Новые вызовы внешней среды как источник возможностей в стратегическом развитии университета»** Ирина Фёдоровна подчеркнула, что Программа социально-экономического развития Республики Беларусь на 2026–2030 годы, утвержденная Решением Всебелорусского народного собрания от 19 декабря 2025 года, созвучна Стратегии развития ГрГУ имени Янки Купалы.

«Для реализации Программы социально-экономического развития страны, которая заключается в обеспечении нового качества жизни для каждого белоруса, нужны квалифицированные кадры нового поколения. А готовить такие кадры – наша с вами задача. Университеты являются центрами образования, науки, воспитания гражданина-патриота, и поэтому деятельность вузов находится под пристальным контролем Главы государства», – сказала ректор.

Ирина Китурко напомнила, что 4 августа во Дворце Независимости прошло совещание у Президента Беларуси по вопросу создания нового учебного и научного центра – Академии интеллектуальных технологий. На этом совещании Президент поставил новую задачу: создание кардинально новой образовательной среды. Эта среда должна быть гибкой, междисциплинарной, ориентированной на результат.

Актуальные задачи и важнейшие вопросы, которые стоят сегодня перед системой образования, обсуждались также и на Второй национальной школе ректоров, которая состоялась 26–27 августа в Минске. Среди них – технологический суверенитет, управление цифровым ландшафтом вуза, инструменты диверсификации экспорта и другое.




В рамках своего доклада ректор остановилась на четырех основных вызовах, которые наиболее остро сегодня стоят перед системой высшего образования. Это трансформация рынка труда и изменение ожиданий потребителей; изменение контингента абитуриентов; турбулентность международной академической среды и воспитание гражданина в условиях цифровой эпохи.

Она подчеркнула, что для подготовки востребованного конкурентного специалиста необходимо четкое взаимодействие с заказчиками кадров: *«Сегодня мы хотим видеть конкретного заказчика для конкретной специальности и конкретных студентов, чтобы вовлекать его в образовательный процесс»*.

Ирина Фёдоровна также отметила высокие качественные показатели приемной кампании – 2026: *«В этом году среди первокурсников большое количество победителей различного уровня олимпиад. Почти 600 человек имеют сумму баллов свыше 300. К нам пришли ребята с золотыми, серебряными медалями и дипломами с отличием после получения среднего специального образования. Особенно хочется отметить доверие к нам абитуриентов из других областей. Имея университеты в своих регионах, они выбирают нас – почти четверть первокурсников не из Гродненского региона. Поскольку мы распределяем 90% выпускников в наш регион, важно, что те, кто приехал из Могилева, Гомеля и других городов и областей, останутся работать на Гродненской земле»*.





Мировые рейтинги	Топ-4
Иностранные студенты	> 25 %
Статьи Scopus	200
ППС с учеными степенями	55 %
Доход от НИИД	> 5 %
Система защиты информации	100 %

Кроме того, в своем докладе Ирина Фёдоровна акцентировала внимание на демографическом сокращении контингента абитуриентов, включении в структуру университета лицея, этике применения искусственного интеллекта, ограничениях налаженных академических связей и многом другом.

В завершение своего выступления ректор пожелала всем участникам образовательного процесса крепкого здоровья, успехов, креатива и высоких достижений. Ведь достижения купаловцев – это достижения университета, региона и страны.

После доклада ректора состоялась церемония подписания Дорожной карты сотрудничества и Договора о взаимодействии учреждения образования «Гродненский государственный университет имени Янки Купалы» с организацией-заказчиком кадров ГРУП «Гродноэнерго». Ректор университета Ирина Китурко и генеральный директор «Гродноэнерго» Андрей Шершень скрепили договор своими подписями.

Мероприятие продолжилось награждением лучших сотрудников и студентов Купаловского университета.

Татьяна СУШКО.
Фото из архива университета

Прием документов в докторантуру и аспирантуру ГрГУ имени Янки Купалы продлится по 30 сентября


Традыцыі

Студэнцкі верасень не ведае шаблонаў

Працяг. Пачатак чытайце на стар.1


Да Дня ведаў Купалаўскі ўніверсітэт рыхтаваўся загаддзя. Ужо 31 жніўня тут панавала асаблівая атмасфера – светлая, хвалюючая і па-сапраўднаму ўрачыстая. Першакурснікі дзённай формы навучання сабраліся разам, каб зрабіць першы крок у студэнцкае жыццё. Традыцыйна першую лекцыю пад назвай «Універсітэт вашых магчымасцей» правяла рэктар Ірына Кітурка.

Першая лекцыя – гэта не проста знаёмства з правіламі і традыцыямі. Гэта размова пра будучыню, пра тое, якія шляхі адкрываюцца перад маладымі людзьмі ў сценах універсітэта:



– Надзвычай важна, каб менавіта з вуснаў рэктара студэнты пачулі, якія магчымасці адкрывае перад імі ўніверсітэт. Гэта тая дарога, па якой мы павінны ісці поплеч – выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты. Шчыра жадаю, каб наш універсітэт стаў для кожнага студэнта ўніверсітэтам іх магчымасцей. Спадзяюся, у будучыні мы будзем ганарыцца імі як выдатнымі выпускнікамі, – адзначыла рэктар Купалаўскага ўніверсітэта **Ірына Кітурка**.

Падчас лекцыі першакурснікі пазнаёміліся з гісторыяй alma-mater, даведаліся пра пазіцыі ўніверсітэта ў міжнародных рэйтынгах і пра тое, чым жыве сучасная купалаўская супольнасць. Перад першакурснікамі адкрылася цэлая палітра для самарэалізацыі: ад навуковых лабараторый і студэнцкіх аб'яднанняў да валанцёрскіх атрадаў, спартыўных секцый і творчых праектаў. Адзінае, што патрабуецца ад студэнта, – матывацыя, шчырае жаданне расці і, безумоўна, дысцыпліна:



– Рэалізаваць сябе я хачу ў спорце, а менавіта ў гандболе. Ірына Фёдараўна адзначыла, што каб дасягнуць пастаўленых мэт, трэба не ленавацца. Калі кожны дзень працаваць над сабой, усё абавязкова атрымаецца. Яна таксама падкрэсліла, што ў любы момант можна звярнуцца да выкладчыкаў з любым пытаннем, і яно будзе вырашана. Гэта не можа не цешыць!

Вельмі каштоўна, што ва ўніверсітэце наладжана такая сувязь, – падзяліўся сваім меркаваннем **Марцін Бяляўскі**, студэнт факультэта фізічнай культуры.

Яркім працягам сустрэчы стала цырымонія «Пасвячэнне ў студэнты». Першакурснікам, якія паказалі найвышэйшыя балы падчас уступнай кампаніі ўручылі іх студэнцкія білеты. Працягнулася свята перадачай Студэнцкага білета і Ключа ведаў ад старэйшых курсаў.



Словы Ірыны Фёдараўны натхнілі першакурснікаў не толькі на сумленную вучобу, але і на актыўнае развіццё ва ўсіх сферах студэнцкага жыцця. З гэтым згодна і **Ульяна Тупякова**, студэнтка факультэта мастацтваў і дызайну:

– Мы атрымалі велізарны зарад матывацыі! Я ўпэўнена, што кожны ўдзельнік сёння не толькі даведаўся шмат новага, але і атрымаў самыя станоўчыя эмоцыі і добры настрой на ўвесь навучальны год. Мяне вельмі зарадзілі дзяўчынкі на сцэне, якія споўнілі для нас энергічны нумар. Адразу загарэлася жаданнем далучыцца.

Сваімі ўражаннямі ад сустрэчы падзялілася і студэнтка факультэта эканомікі і кіравання **Паліна Бяляцкая**:

– Перад сустрэчай крыху хвалявалася. Але калі на сцэну выйшла Ірына Фёдараўна, хваляванне змянілася на зацікаўленасць, а потым – на сапраўдную матывацыю. Асабліва мяне кранулі словы пра тое, што выкладчыкі будуць дапамагаць кожнаму студэнту раскрываць свае моцныя бакі. Гэта вельмі каштоўна, бо ў кожным з нас ёсць патэнцыял. Мне здаецца, пасля гэтай сустрэчы многія першакурснікі канчаткова пераканаліся, што зрабілі правільны выбар.

Напрыканцы лекцыі Ірына Кітурка падзялілася з першакурснікамі чатырма «лайфхакамі ад рэктара», якія дапамогуць зрабіць студэнцкія гады максімальна паспяховымі:

№1 – **«Праца дзеля выніку»**. Галоўная мэта – не проста прысутнічаць у аўдыторыі, а штодня набываць веды і кампетэнцыі.

№2 – **«Усё ў вашых руках»**. Поспех студэнта залежыць ад яго ўласнай ініцыятывы, настойлівасці і прагі да развіцця.

№3 – **«Адзінства»**. Выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў аб'ядноўвае адно ганаровае імя – купалаўцы.

№4 – **«Рашучае дзеянне»**. Не варта чакаць, пакуль пытанне ператворыцца ў праблему. Трэба дзейнічаць адразу.

Фіналам сустрэчы стала ўрачыстая клятва. Першакурснікі паабяцалі годна несці званне студэнта Купалаўскага ўніверсітэта, упэўнена спасцігаць навуковыя вяршыні і быць у самым віры ўніверсітэцкага жыцця.

А наперадзе купалаўцаў чакаюць новыя адкрыцці, дасягненні і перамогі. Няхай кожная лекцыя набліжае студэнтаў да мары, кожны семінар развівае думку, а сяброўскія сустрэчы робяць гэты шлях сапраўды незабыўным.

Анжаліка СЦЕФАНОВІЧ.
Фота з архіва ўніверсітэта



В ГрГУ состоялась встреча с делегацией Ассоциации ЮНЕСКО провинции Ганьсу

Уступная кампанія 2026

Калі ласка, цягніце білет!

Штогод Купалаўскі ўніверсітэт з радасцю прымае ў сваю вялікую сям'ю новае пакаленне студэнтаў. Першакурснікам яшчэ толькі давядзецца адкрыць для сябе гэты захапляльны свет: першая лекцыя, сумесны праект… І, у рэшце рэшт, першая сесія.
І мы вырашылі не чакаць экзаменаў, а адразу арганізавалі для хлопцаў і дзяўчат своеасаблівы «іспыт». Праўда, у нашых білетах замест навуковых пытанняў – адкрытыя размовы пра мары і сакрэты поспеху. Знаёмімся з нашымі зорачкамі-першакурснікамі і кажам з усмешкай: «Калі ласка, цягніце свой білет»!



Білет №3. Як атрымаць найвышэйшы бал ва ўсім універсітэце і паступіць на спецыяльнасць мары?

Першай на наш своеасаблівы «іспыт» завітала **Крысціна Карповіч**. Дзяўчына скончыла сярэднюю школу № 27 імя В. Юртава горада Гродна і па выніках уступнай кампаніі паказала найлепшы вынік ва ўсім універсітэце – 393 балы! Такі высокі ўзровень ведаў дапамог дзяўчыне дасягнуць мэты і паступіць на спецыяльнасць «Міжнароднае права».

Пытанне 1. Як праходзіла падрыхтоўка да іспытаў і чаму менавіта «Міжнароднае права»?

– Я вельмі доўга вучыла англійскую мову і, пачынаючы з 6 класа, штогод удзельнічала ў алімпіадах па гэтым прадмеце. У 9 класе ў нас з'явілася «Грамадазнаўства», прадмет адразу захапіў мяне разнастайнасцю тэм. Мяне цікавілі ўсе пытанні, але больш за ўсё падабаліся раздзелы «Палітыка» і «Права». І ў той момант я вырашыла аб'яднаць гэтыя два накірункі, так і абрала юрыдычны факультэт. Бліжэй мне менавіта міжнародная сфера, хочацца працаваць там, дзе сутыкаюцца розныя прававыя сістэмы і трэба шукаць агульныя рашэнні.

Паспяхова падрыхтавацца да экзаменаў мне дапамагло якаснае планаванне. На пачатку тыдня я пісала дакладны план, калі і што мне трэба прачытаць ці зрабіць. Гэта дапамагала не блытацца.

Пытанне 2. Пасля такога эфектнага пачатку якім бачыце сваё студэнцкае жыццё?

– Канешне, вельмі хачу паўдзельнічаць у конкурсе «Alma Mater – любоў з першага курса»! На маю думку, менавіта з гэтага мерапрыемства павінна пачынацца студэнцкае жыццё. Таксама хочацца паўдзельнічаць у конкурсе «Міс і Містар універсітэт». Надалей планую трымаць такую ж высокую планку ў Купалаўскім універсітэце!

Пытанне 3. Што б Вы сказалі Крысціне-адзінаццацікласніцы, якая толькі пачынае свой шлях да мэты?

– Думаю, я ёй параіла б не хвалявацца наконт паступлення на бюджэт. Нават з улікам таго, што такіх месцаў усяго 10!



Білет № 16. Як знайсці сваё прызначэнне яшчэ ў дзяцінстве?

Наш наступны першакурснік – **Аляксандр Галушка**, выпускнік сярэдняй школы № 32 імя Т. Ларыёнавай горада Гродна. Юнак вучыўся ў інжынерным класе і паступіў на спецыяльнасць «Будаўніцтва будынкаў і збудаванняў».

Пытанне 1: Што паўплывала на Ваш выбар мэтавага накіравання?

– Насамрэч я доўга вагаўся, але ў выніку зразумеў, што мэтавае накіраванне – гэта добры варыянт. Гэта гарантаванае першае працоўнае месца з дакладным разуменнем перспектыў.

Пытанне 2: Як навучанне ў інжынерным класе паспрыяла паспяховаму праходжанню ўступных выпрабаванняў?

– Профільнае навучанне вельмі дапамагло мне на субяседаванні. Нам задавалі пытанні як па тэорыі, так і па практыцы, якія мы дэталёва разбіралі ў школе. За час навучання ў інжынерным класе я паспеў засвоіць праграмы для мадэлявання, таму адчуваў сябе на іспыце даволі ўпэўнена.

Пытанне 3: Калі і чаму вырашылі звязаць сваё жыццё менавіта з будаўніцтвам?

– Калі я сур'ёзна задумаўся пра выбар прафесіі, бацька прапанаваў прыгледзецца да будаўніцтва. Бо мне цікава нешта майстраваць, будаваць і разбірацца ў чарцяжах.

Білет №27. Як спалучыць алімпійскія амбіцыі і мару пра трэнерскую кар'еру?

Наступная гераіня нашага «іспыту» – **Кацярына Гульнік**. Дзяўчына скончыла Рэспубліканскае вучылішча алімпійскага рэзерву і ўжо паспела пакарыць п'едэстал, заваяваўшы бронзавы медаль на першынстве Еўропы па вольнай барацьбе!

Пытанне 1: Як Вы трапілі ў спорт і чаму вырашылі звязаць сваё жыццё з трэнерскай дзейнасцю?

– У мяне ёсць старэйшыя браты, якія таксама займаюцца барацьбой. Менавіта яны ў 7 гадоў прывялі мяне на першую трэніроўку.

Калі я толькі пачала займацца, мне спадабалася стаўленне майго першага трэнера Ігара Паромніка да дзяцей. Ён пры любых абставінах быў побач і не даваў сумаваць пасля пройгрышу. Таксама вельмі карыснымі былі яго парады, якія дапамаглі стаць больш упэўненай як у барацьбе, так і ў жыцці. Тады я і вырашыла, што вырасту і стану таксама трэніраваць юных спартсменаў.

Зараз жа я буду трэніравацца ва Уладзіміра Мельнікава ў Гродзенскім абласным комплексным цэнтры алімпійскага рэзерву, але майму першаму трэнеру заўсёды буду бязмерна ўдзячная.

Пытанне 2: Якімі былі Вашы першая перамога і найбольш знакавы поспех на высокім узроўні?

– Сваю першую перамогу я здабыла яшчэ ў 3 класе. Гэта было надзвычай цікава і хвалюючa! Побач знаходзіліся блізкія і родныя людзі, якія падтрымлівалі мяне перад кожным этапам.

Перад першынствам Еўропы падрыхтоўка была вельмі інтэнсіўнай і акуратнай, каб пазбегнуць траўм. З намі праводзілі гутаркі, скіроўвалі на тое, каб выходзіць на дыван і нікога не баяцца, перамагаць суперніцу за суперніцай. Гэта давала больш матывацыі і ўпэўненасці. Калі я змагалася за бронзавы медаль, то моцна хвалявалася, але побач была мой трэнер Уладлена Выдранка. Яна размінала мяне і настройвала на поспех.



Пытанне 3: Якую галоўную спартыўную і жыццёвую мэту Вы ставіце перад сабой цяпер?

– На дадзены момант мая галоўная мэта – стаць чэмпіёнкай свету і ўпэўнена замацаваць статус лідара ў сваёй вагавай катэгорыі. Я штодня шчыра працую і крок за крокам іду да мэты!



Білет № 15. Як працягнуць рух да мары пасля першай заваяванай вышыні?

Для наступнай удзельніцы нашага інтэрактыву такія паняцці, як «сесія» і «экзамен», ужо добра знаёмыя. **Святлана Сахацкая** скончыла Мінскі дзяржаўны каледж лёгкай прамысловасці і комплексная лагістыкі. Сёння дзяўчына абрала спецыяльнасць «Дызайн касцюма і тэкстылю» і паступіла ў Купалаўскі ўніверсітэт без уступных экзаменаў як прызёр рэспубліканскага прафесійнага конкурсу!

Пытанне 1: Што натхніла Вас звязаць жыццё з дызайнам і чаму для атрымання вышэйшай адукацыі абралі менавіта ГрДУ імя Янкі Купалы?

– Дзякуючы ўдзелу ў Рэспубліканскім конкурсе прафесійнага майстэрства я зразумела, што хачу вучыцца і развівацца далей. Мяне вельмі цікавіць мода! Да таго ж маім галоўным дарадчыкам заўсёды была маці. Менавіта яна адразу сказала, што гэта надзвычай цікавы накірунак, дзе ёсць куды расці.

Чаму абрала менавіта Купалаўскі ўніверсітэт? Я вельмі хацела атрымаць якасную вышэйшую адукацыю. Падчас дня адчыненых дзвярэй паразмаўляла з выкладчыкамі – надзвычай чулымі і прафесійнымі людзьмі.

Пытанне 2: Які праект Вам найбольш запомніўся?

– У конкурсны рух я ўключылася яшчэ падчас навучання ў каледжы. Пасля конкурсу прафесійнага майстэрства адным з найбольш знакавых выпрабаванняў стаў конкурс «Абілімпікс» у Маскве, дзе я заняла другое месца.

Конкурсны працэс вельмі захапляльны. Напрыклад, у Мінску ўсім удзельнікам далі заданне сшыць камізэльку па аднолькавых лекалах. Але кожны павінен быў творча дапрацаваць яе, дадаць нацыянальную сімволіку і аўтарскія дэталі.

Пытанне 3: Чым любіце займацца ў вольны час і што дапамагае знаходзіць натхненне?

– Акрамя моды, я захапляюся фатаграфіяй. Люблю ладзіць для сябе фотасесіі, рабіць эстэтычныя кадры, але найбольш натхняюся прыродай.

За плячыма першакурснікаў – унікальная гісторыя паступлення, поўная яркіх перамог і важных крокаў на шляху да ўласнай мары. І хоць у кожнага цяпер пачынаецца свой непаўторны шлях, усе гэтыя сцежкі сыходзяцца ў адну вялікую дарогу, якую пракладвае Купалаўскі ўніверсітэт, каб дапамагчы раскрыць патэнцыял кожнага студэнта. Мы шчыра рады вітаць вас у нашай вялікай сям'і, дарагія першакурснікі!

Анжаліка СЦЕФАНОВІЧ.
Фота з архіва герояў

Ученые ГрГУ приняли участие в работе общественного координационного экологического совета

«Кожны народ мае хаця б адзін геніяльны твор, і гэты твор – МОВА»

Ведаць мовы карысна для памяці і цікава для душы. У жніўні адразу дзве летнія школы ГрДУ імя Янкі Купалы сталі месцам філалагічных адкрыццяў для замежных гасцей. Давайце разам даведаемся, чаму хутка ўвесь Варонеж загаворыць па-беларуску і як нашы слухачы вучылі свае першыя хуткамоўкі!

Летняя школа беларускай мовы і культуры «Пад светлым іменем Купалы» – гэта ўнікальная прастора для тых, хто жадае спасцігнуць багацце беларускага слова і дакрануцца да глыбінь нацыянальнай спадчыны. У сценах навуковай бібліятэкі шосты раз шчыра ўсміхаліся тым, хто прыязджае ў Гародню ўжо не першы год, і з адкрытым сэрцам віталі новых аматараў беларускага слова.

12 дзён, 13 удзельнікаў – адна мова

Геаграфія праекта штогод пашыраецца: традыцыйна да нас прыязджаюць студэнты Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ламаносава і Варонежскага дзяржаўнага ўніверсітэта. Сёлета да іх далучыліся выкладчыца Педагагічнага каледжа імя Някрасава з Санкт-Пецярбурга і прадстаўнікі Маскоўскага педагагічнага дзяржаўнага ўніверсітэта.



Агулам навучэнцаў чакала каля 50 акадэмічных гадзін паглыбленага вывучэння беларускай мовы. Распарадак дня быў пабудаваны максімальна эфектыўна: першая палова адводзілася пад інтэнсіўныя аўдыторныя заняткі, а другая прысвячалася знаёмству з самабытнасцю і непаўторнасцю нашай культуры на майстар-класах і экскурсіях.

Навучальны блок ахапіў найбольш цікавыя раздзелы лінгвістыкі. Падчас заняткаў па арфаэпіі ўдзельнікі адпрацоўвалі правільнае вымаўленне і мілагучнасць мовы. Асобную лекцыю прысвяцілі вобразу жанчыны ў беларускай парэміялогіі – прыказках і прымаўках, якую правяла дацэнт кафедры беларускай філалогіі Марыя Якалцэвіч. Заняткі выклікалі шчырую зацікаўленасць у **Пятра Фядосава**:

– Я не першы раз прыязджаю ў Летнюю школу, таму раней ужо чуў лекцыі Марыі Антонаўны. Гэты глыбокі лінгвістычны падыход да аналізу прыказак – сапраўды ўнікальны досвед, якога раней не сустракаў. Мне асабліва запомнілася вельмі цёплая прыказка: «Няма той крамы, дзе прадаваліся б мамы».

Фразеалагічную спадчыну, якая лічыцца адной з найбагацейшых у славянскім свеце, удзельнікам раскрыла дацэнт кафедры беларускай філалогіі **Ірына Хлусевіч**.

– Тэарэтычная частка прысвечана разбору спецыфікі ўласнабеларускіх фразеалагічных адзінак. У практычным блоку я паставіла на мэце паказаць, як творча выкарыстоўваюцца і абыгрываюцца фразеалагізмы ў сучасных беларускамоўных СМІ.

Існуе меркаванне, быццам ў беларускай мове ўсё проста: як чуецца, так і пішацца. Аднак гэта зусім не так! Разам са старшым выкладчыкам кафедры прыродазнаўчых і лінгвістычных дысцыплін і методык іх выкладання Святланай Грынько слухачы даведаліся пра існаванне двух ключавых прынцыпаў арфаграфіі – фанетычнага і марфалагічнага.

Таксама для ўдзельнікаў школы быў падрыхтаваны блок тэматычных лекцый па беларускай літаратуры. Слухачы паглыбіліся ў свет жаночай паэзіі і спасцігліі творчую спадчыну Івана Мележа. Пра талент генія, роўнага якому па маштабе і глыбіні ў беларускай прозе дагэтуль не з'явілася, навучэнцам распавяла дацэнт кафедры беларускай філалогіі **Святлана Тарасава**:

– Унікальнасць Івана Мележа тлумачыцца тым, што сваім Палессем ён нанова адкрыў беларусам Беларусь. Яго творы – гэта міні-праекцыя таго, як жывуць розныя рэгіёны нашай краіны. Нягледзячы на тое, што кожны куток мае самабытныя рысы, тыя адзнакі, якія вылучыў Іван Мележ у сваёй «Палескай хроніцы», з'яўляюцца найбольш рэалістычнай асновай, характэрнай для беларускага народа ў цэлым.

Знаёміліся з беларускай культурай удзельнікі Летняй школы разам з дацэнтам кафедры гісторыі Беларусі, археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін **Аляксандрам Горным** на занятках, прысвечаных фарміраванню нацыянальнай беларускай ідэі:

– Лічу, што слухачам школы гэтая тэма вельмі карысная. Яны павінны разумець, як беларуская мова развівалася ў гістарычным кантэксце, як набывала свае грамадскія, культурныя і інтэлектуальныя рысы.

Маляўнічыя краявіды замест парт

Праграма Летняй школы не абмяжоўвалася толькі аўдыторнымі заняткамі. Для ўдзельнікаў былі падрыхтаваны аглядныя экскурсіі па Гародні з абавязковым наведваннем Каложскай царквы. Як кажуць самі ўдзельнікі, «у Гародні Каложы многа не бывае!».

Таксама на дзень навучэнцы змянілі ўтульныя сцены бібліятэкі на гістарычныя куткі Навагрудчыны і Карэліччыны. Першым прыпынкам стаў аддзел рамёстваў Навагрудскага раённага цэнтра культуры і народнай творчасці, дзе для гасцей правялі майстар-клас па выцінанцы і выбіванцы.

Пасля агляднай экскурсіі па знакавых месцах першай сталіцы ВКЛ падарожнікі накіраваліся ў аграгарадок Райца, дзе завіталі ў сядзібу Раецкіх-Путкамераў. Тут іх чакаў яшчэ адзін творчы майстар-клас па саломапляценні.

Другі экскурсійны дзень быў прысвечаны падарожжу на Аўгустоўскі канал і ў Сапоцкін, дзе ўдзельнікі







абудзілі сваё творчае натхненне на майстар-класе па беларускай пісанцы.

Працэс, які немагчыма спыніць

За плячыма ўдзельнікаў – гадзіны інтэнсіўных заняткаў. Пра тое, як змяніўся ўзровень ведаў навучэнцаў і якая галоўная мэта праекта, распавёў дырэктар навуковай бібліятэкі і ідэйны натхняльнік школы **Мікалай Грынько**:



– Вядома, ставіць амбіцыйную задачу, каб чалавек, які ніколі не чуў беларускай мовы, загаварыў на ёй за два няпоўныя тыдні, нельга. Наша мэта – зацікавіць удзельніка, які прыязджае з-за мяжы, настолькі, каб ён сказаў: «Беларусь – гэта класна, а мова – гэта цудоўна». І мы ўжо бачым вынікі. Навучэнцы выходзяць на беларускія сайты, чытаюць кнігі, навіны і камунікуюць паміж сабою па-беларуску. Працэс запушчаны, і мы вельмі спадзяёмся, што ён незваротны.

Аднак час няўмольны, і два насычаныя тыдні Летняй школы завяршыліся. Сваімі яркімі ўражаннямі падзялілася **Алена Дзмітрыева**:

– Я бязмерна ўражана вашай гасціннасцю, універсітэтам, выдатнай бібліятэкай, высокім прафесіяналізмам спецыялістаў і, безумоўна, беларускай культурай, якая проста не мае аналагаў у свеце. Гэта быў унікальны і вельмі каштоўны досвед.

Сваімі пачуццямі таксама падзя-

Команда ГрГУ приняла участие в III международных тренировочных сборах по спортивному программированию в г.Баку

лілася **Дар'я Гальцова**:

– Для мяне Летняя школа – гэта месца адпачынку і адначасова прафесійнага росту. Гэта маё «месца сілы», дзе наталяешся энергіяй на ўвесь наступны год. Але я прыехала не адна, а са сваімі студэнтамі. Наша воронежская дэлегацыя ўвесь час расце: у першы год нас было два чалавекі, а сёлета – дзесяць удзельнікаў! Гэтыя два тыдні назіраю за імі і бачу, наколькі яны розныя, але кожны з іх знайшоў у школе нешта сваё: тое, што кранула, зацікавіла і ўразіла менавіта яго.



Госці нездарма пажартавалі: з такой шчырай пяшчотай да беларускага слова з боку воронежскіх студэнтаў не дзіўна, калі хутка іх намаганнямі ўвесь Воронеж загаворыць па-беларуску!

У апошні дзень удзельнікі атрымалі сертыфікаты, якія пацвярджаюць паспяховы ўдзел у Летняй школе «Пад светлым іменем Купалы». А паколькі кожнае добрае падарожжа павінна заканчвацца сюрпрызамі, арганізатары падрыхтавалі для гасцей падарункі – гарадзенскія пернікі.

Далей навучэнцаў чакаў Дзень самакіравання пад сімвалічнай назвай «Дзе шчаслівым можна быць? У Гародні!!!». Паводле задумы, кожны падрыхтаваў кароткі аповед пра сябе, а таксама творчы падарунак. Першай выступіла **Арына Навікова:**

– Што такое шчасце? Шчасце – гэта людзі, якія побач з табой. Але як перадаць шчасце ў Гародні? Задача складаная, бо выбар уражанняў проста бязмежны! Я трохі ўмею маляваць, таму вырашыла стварыць партрэты нашых удзельнікаў і выкладчыкаў.

Малюнкі Арыны не проста адлюстравалі яе захапленне беларускай культурай, а сталі сапраўдным летапісам Летняй школы.

І гэта яшчэ не ўсё! За два тыдні супольнага жыцця ў удзельнікаў з'явіліся свае жарты: пра «ўзровень трасянкі – С2» і пра выраз «ёсць пытанейка». Асобнае месца занялі практыкаванні па вымаўленні любімага гуку [ч] – абавязкова цвёрдага!

Развітвацца з Летняй школай не хацелася нікому: ні ўдзельнікам, ні арганізатарам. Але мы не кажам нашым гасцям «бывай!», а толькі шчырае і цёплае «да сустрэчы!». Да сустрэчы на VII Летняй школе беларускай мовы і культуры «Пад светлым іменем Купалы»!

М. Горький: «Язык – инструмент, необходимо хорошо знать его, хорошо им владеть»

Три недели интенсивной учебы, погружение в новую культуру и сотни ярких открытий – именно такой запомнится участникам традиционная Летняя школа русского языка. В этом году проект объединил студентов из Китая и Германии. Под руководством опытных преподавателей кафедры русской филологии иностранные гости не просто изучали грамматику, а ежедневно оттачивали разговорную речь в живом общении.

Учебный интенсив был рассчитан на 60 академических часов. По словам руководителя Летней школы русского языка **Инны Самойловой**, обучение иностранцев кардинально отличается от работы с носителями: здесь нужна особая методика прикладной лингвистики и полное погружение в среду.

Русский язык звучал для участников не только в аудиториях, но и на улицах города, в магазинах, транспорте и при решении любых бытовых вопросов. Кроме того, группы сознательно формировали из представителей разных стран. Интернациональный состав не оставлял студентам шанса перейти на родной язык, поэтому между собой они общались исключительно по-русски.

Слушателей распределили по группам на основе тестирования. Для новичков главной задачей было преодолеть языковой барьер и «развязать язык». А китайские студенты 3 курса филологического факультета уже хорошо знали грамматику, но нуждались в живом общении.

Ежедневные четырехчасовые занятия охватывали все 4 вида речевой деятельности: чтение, говорение, аудирование и письмо.

Полезным дополнением к базовой программе стали 10-часовые спецкурсы по выбору: «Деловой русский», «Лингвострановедение» и «Караоке по-русски». Последний вызвал у зарубежных гостей особый интерес. Через исполнение известных песен студенты в легкой игровой форме отрабатывали правильное произношение и пополняли словарный запас.

Китайско-немецко-белорусская группа прибыла!

Пока преподаватели раскрывали тонкости «великого и могучего», в решение повседневных задач включались студенты-волонтеры. Именно они встречали зарубежных гостей на вокзале, помогали с заселением в общежитие и за три недели стали для участников настоящей опорой и верными друзьями.

В волонтерскую команду вошли студенты двух факультетов – филологического, а также истории, коммуникации и туризма. Будущие филологи строго придерживались правила общаться с гостями исключительно по-русски, поддерживая непрерывную языковую среду. А вот для студентов ФИКиТа, владеющих китайским и английским языками, участие в образовательном проекте стало бесценным опытом. Они работали «подсказчиками» на лекциях по истории и культуре Беларуси, переводя участникам речь лектора. Результат такой заботы оказался намного глубже решения бытовых вопросов.

– Наши волонтеры всё время находились рядом со студентами. Дорогого стоит простое сообщение «Инна Юрьевна, китайско-немецко-белорусская группа находится на экскурсии». И сегодня на закрытии на вопрос «что вы приобрели в Гродно?» наши иностранные гости, не раздумывая, ответили – «мы обрели новых друзей», – с улыбкой отмечает Инна Самойлова.






Эмоции, культура и открытия

Помимо учебы, для участников подготовили насыщенную культурно-познавательную программу. Гости побывали на экскурсиях в Коложском парке, у стен древней Борисоглебской церкви, в гродненских замках, Музее истории Городницы и величественном Фарном костеле.

Особенно запомнились неформальные мероприятия: душевный пикник на природе, визит в телерадиокомпанию «Гродно», а также яркий интернациональный вечер. На нем представители Китая, Германии и Беларуси презентовали культуры друг друга на русском языке и дегустировали национальные блюда. А на кулинарном мастер-классе зарубежные студенты ближе познакомились с белорусскими традициями.



«Мне очень нравится этот красивый старый город. Здесь много зданий и красивых парков. В университете преподаватели понятно объясняют грамматику. Сначала мне было трудно говорить по-русски, но сейчас я чувствую, что мой язык улучшается. На занятиях мы читали тексты и делали упражнения. Очень рада, что приехала сюда. Эта поездка дала мне много новых знаний и ярких впечатлений. Буду вспоминать об учебе здесь еще долгое время», – поделилась впечатлениями участница из Китая **Ли Цзя Синь**.

«Я перестала бояться говорить!»

Кульминацией трехнедельного марафона стало торжественное закрытие Летней школы с вручением сертификата о прохождении курса. Однако самыми яркими показателями успеха стали эмоции самих слушателей. В последний день на прощальном мероприятии зарубежные участники искренне обнимались, плакали на плечах преподавателей и волонтеров, ведь расставаться с уютным Гродно и новыми друзьями никому не хотелось.

– Мне очень понравилась Летняя школа, и я очень полюбила Гродно. Так рада, что смогла сюда приехать. Преподаватели и волонтеры здесь очень добрые и душевные. Здесь я начала понимать русский язык, улучшила разговорную речь, а самое главное – перестала бояться говорить! Это огромный шаг. Мне очень жаль уезжать. Но расставание – это часть пути. Надеюсь, я сохраню эту любовь к русскому языку и буду продолжать учить его дальше, – трогательно поделилась своими эмоциями участница из Китая **Ван Кайнань**.

Летняя школа в очередной раз доказала: русский язык – это живой, вдохновляющий мир, способный стирать любые границы и объединять людей с разных континентов.

Анжаліка СЦЕФАНОВІЧ.
Фота з архіва ўніверсітэта

В ГрГУ имени Янки Купалы прошло вручение дипломов магистрантам из КНР

Событие

